Przesyłka opłacona ryczałtem

№ 17 Серада, 16-га Чэрвеня 1926 г. м. Вільня Год I

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнa… …торыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на пал… …ратызм.—Барацьба з комунізмам.—Нацыянальная царква.—Краевая …далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падп… зл. … 2 зл. 50 гр. з…цу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno, ul. Niemiecka 1 Hotel „Sokołowski" pokój Nr 23. Рэдакцыя адчынена ад 12 — 2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам — 20 гр.
,, сярод тэксту — 25 гр.
,, на апош. стар. — 10 гр.
За радок нонпарэля.

СЬВІТАЕ...

Польскія левыя партыі вынесьлі рад рэзалюцыяў, у якіх гаворыцца аб адносінах да нацыянальных меншасьцяў—беларусаў і ўкраінцаў, адносна якіх дасюлешняя ўлада, пад уплывам польскага нацыяналізма, праводзіла палітыку ўціску і зьдзеку.

У рэзалюцыі „Клюба Працы", — палітычнай групы, на чале якой да апошняга часу стаяў цяперашні прэмьер, — выразна сказана між іншым наступнае:

„...*Будзем змагацца з усялякім нацыянальным уціскам і імкнуцца да таго, каб пры разьвіцьці самаўрадаў ува ўсіх дзельніцах Рэчыпаспалітай з перавагай беларускага і ўкраінскага насяленьня была уведзена тэрытарыяльная аўтаномія...*"

Як бачым, польская дэмакратыя, у магчымасьць супрацоўніцтва з якой мы заўсёды верылі і да гэтага заклікалі беларускае грамадзянства, гэтая дэмакратыя, разумеючы, што агульнае дабро ўсіх жыхароў Польскай Дзяржавы вымагае супольнай працы ўсіх нацыянальнасьцяў, — працягвае руку да гэтай супольнай працы нацыянальным меншасьцям, а таксама і для супольнага змаганьня з усялякімі праявамі нацыянальнай неталеранцыі, як з аднаго, гэтак і з другога боку.

Заўтрашні дзень бязумоўна нясе для нашай „Богам забытай старонкі" лепшую будучыну.

Пасьля 4-гадовай ночы, у часе якой у нашым краі гуляла безпрасьветная польская рэакцыя, заясьнеў золак палёгкі, ужо сьвітае...

Цяпер усе мы пачынаем жыць з надзеяй, што нешта станецца, што сілы дэмакратыі ўзмацуюцца, што пачнецца перабудова жыцьця. І вось у гэтым—ёсьць вялікае гістарычнае значэньне падзеяў, якія сёньня мы перажываем.

У цяперашні мамэнт мы, беларусы, павінны дабыць з сябе максімум творчай энэргіі, каб у гэтую гістарычную часіну не праспаць магчымасьцяў, якія шырока разварачваюцца перад намі, каб распачаць у нашым жыцьці шырока культурную працу, якая дасьць нам у будучыне маральную і матэрыяльную сілу.

Нельга марнаваць шчасьлівага мамэнта; гісторыя не паўтараецца!

Беларускі Пасольскі Клюб і ўсе выйшаўшыя з яго палітычныя ўгрупаваньні, заняўшы адразу апазыцыйнае становішча, дагэтуль рабілі толькі нэгатыўную работу.

Першае беларускае парлямэнцкае прадстаўніцтва збанкрутавала, дзякуючы зусім нежыцьцёвай палітычнай праграме і поўнай няздольнасьці да рэальнай і творчай палітычнай працы. У апошні час яно адкрыта стала на шлях выразнага „рэвалюцыянізма".

Мы зазначалі ўжо, што вялікую ролю ў гэтым ацыграў рэакцыйны дзяржаўны рэжым, але, паўтараем, галоўная прычына — ляжыць у поўнай няздольнасьці нашых паслоў да творчай палітычнай працы.

І вось у цяперашні гістарычны мамэнт, у рэзультаце банкроцтва нашага парлямэнцкага прадстаўніцтва, кіраўніцтва беларускай палітыкай, думкай і культурнай працай пераходзіць у рукі таго палітычнага ўгрупаваньня, якое ў хвіліну рашучай барацьбы польскай дэмакратыі з рэакцыяй — адкрыта і выразна станула на бок дэмакратыі, на чале якой стаяў Язэп Пілсудскі, да якога беларускі народ, як да сына нашае зямлі, адносіцца з даверыям, бо ён у мамэнт, калі нашу зямельку дратаваў бот бальшавіцкага салдата, прыйшоў да нас з вялікім клічам: „вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі!"

Кліч, праўда, застаўся толькі клічам і хутка прагудзеў. Вялікія *магчымасьці* ня зьдзейсьніліся, але... не па віне Пілсудскага.

Дык ў цяперашні мамэнт, калі ізноў голасна гудзе кліч польскай дэмакратыі, мы прыймаем працягнутую нам руку згоды і заклікаем усіх беларусаў, якія ўмеюць разумна, палітычна думаць, гарнуцца пад наш сьцяг.

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

Апошнія падзеі ў Польшчы адцягнулі агульную ўвагу ад таго, што дзеецца ў Заходняй Эўропе. Гэтаксама як і Польшча, паважны палітычны крызіс перажываюць Англія і Францыя. Праўда Англія перамагла агульную забастоўку, але забастоўка ў вугальнай прамысловасьці, якая прыносіць вялікія страты для дзяржавы, яшчэ не закончана. Ангельскі ўрад не мяшаецца ў барацьбу работнікоў з прадпрыемцамі, пакуль гэтая барацьба не выходзіць за легальныя межы. А толькі ўмяшацельства ў гэтую барацьбу бальшавікоў, якія ўвесь час прысылаюць бастуючым работнікам грашовыя субсыдыі, прымусіла многіх консэрватыўных дэпутатаў выступіць з дамаганьнем да ураду высылкі за межы Англіі бальшавіцкіх гандлёвых прадстаўнікоў. Але за апошні час Англія мела вялікую мірную перамогу на Д. Усходзе. Перадусім аканчальна ўладжаны ангельска-турэцкі канфлікт з-за Массула і Іраку які ам ль не выклікаў вайны паміж гэтымі дзяржавамі. Турцыя самахоць і без ніякага прымусу падпісала з Англіяй дагавор, які аканчальна разьвязвае спрэчку аб Масульскай нафтавай тэрыторыі. Згодна гэтага дагавора Турцыя згадзілася на вызначэньне запрапанаванай Англіяй граніцы ў Масуле і Іраку і за гэта будзе атрымліваць ад Англіі 10 процэнтаў усей дабываемай нафты. Калі да гэтага даба іць, што гэткі-ж самы дагавор Турцыя падпісала і з Францыяй адносна Сірыі, дык будзе ясна, якая гэта вялікая няўдача для савецкай палітыкі, увесь час падтрымліваўшай непарадкі ў Малай Азіі. Згода Англіі з Турцыяй гэтак сама будзе мець добры ўплыў і на настрой у Індыі і іншых азіяцкіх і афрыканскіх магамэтанскіх краях. Бязумоўна мела яна уплыў і на Эгіпет, у якім нядаўна амаль не дайшло да аружнага канфлікту паміж эгіпціянамі і ангельцамі. Як ведама на апошніх выбарах у эгіпецкі парлямэнт поўную перамогу атрымалі нацыяналісты на чале якіх стаіць праконаны вораг Англіі Заглул-Паша. Рэзультатам гэтых выбараў павінен быў быць пераход улады да Заглуль-Пашы і перамена эгіпецкай палітыкі ў адносінах да Англіі. Англія, як ведама, хаця і прызнала незалежнасьць Эгіпта, але ўтрымлівае там свае вайсковыя гарнізоны, якія ей патрэбны для абароны Суэцкага канала і шляха на Судан. Апрача гэтага Англія мае выключнае права на эксплёатацыю хлопкавых плянтацыяў у Эгіпце. Ад гэтых сваіх прывілеяў Англія ня можа ніколі адмовіцца, бо яны маюць для яе вялізнае значэньне. Дзеля гэтага, пасьля перамогі на апошніх выбарах эгіпецкіх нацыяналістаў, якія імкнуцца да поўнай фактычнай незалежнасьці Эгіпта, Англія выступіла з энэргічным трэбаваньнем, якое падтрымала ваеннай дэманстрацыяй, каб Заглуль-Паша адмовіўся ад прыняцьця ўлады. І апошні згадзіўся на гэта, дазволіўшы заняць становішча прэмьера свайму прыхільніку Адлі-Пашы. У Англіі добра разумеюць, што гэты крок Заглуль-Пашы яшчэ не паказвае, што ён аканчальна адмовіўся ад зьдзейсьненьня сваіх нацыянальных ідэалаў.

Перамога ангельскай дыплёматыі на Бл. Усходзе, разам з ліквідацыяй паўстаньня Абд-эль-Крыма ў Мароко, павінна прывясьці да аканчальнай пацыфікацыі Азіі і Афрыкі і разьвязаць Англіі рукі для ўладжаньня ўнутраных яе справаў.

Гэткае-ж вялікае значэньне для Францыі і Гішпаніі мае капітуляцыя Абд-эль-Крыма ў Мароко. Францускія соцыялісты і комуністы, як ведама, увесь час дамагаліся ад свайго ўраду спыненьня вайны з мараканскімі паўстанцамі. Каб здаволіць гэтыя дамаганьні соцыялістаў і дакацаць сваё імкненьне да мірнага ўладжаньня канфлікта, францускі ўрад, у паразуменьні з гішпанскім, перад пачаткам вясеньняй кампаніі, пачаў з Абд-эль-Крымам мірныя перагаворы, запрапанаваўшы даволі карысныя для паўстанцаў варункі. Але дэлегаты Абд-эль-Крыма гэтых варункаў не прынялі і перагаворы былі спынены. Адразу жа пасьля гэтага пачалося агульнае наступленьне францускіх і гішпанскіх войскаў, якое закончылася поўнай перамогай. Бачучы, што яго справа праіграна, Абд-эль-Крым сдаўся французам. Гэтак закончылася геройская трохгадовая барацьба паўстаўшага мараканскага племені Кабілаў проці Гішпаніі, а пасьля і Францыі. Цяпер ізноў паўстала міжнародная спрэчка адносна ўрэгуляваньня сфэр уплываў у Мароко і Танжэры. Справа гэтая была вырашана на Мадрыдскай канфэрэнцыі яшчэ ў 1912 годзе. Але цяпер Англія, Італія і Амэрыка дабіваюцца перагляда гэтага пытаньня нанова. Усёж-ткі ліквідацыя мараканскага паўстаньня, разам з замірэньнем у Сірыі, дае гэтак сама магчымасьць і францускаму ўраду зьвярнуць вялікшую ўвагу на ўнутранае фінансавае палажэньне, якое лічыцца амаль не катастрафічным. Нядаўна курс франка дасягнуў 170 за фунт штэрлінгаў (10 руб. золат.). Гэтаму шмат дапамаглі францускія соцыялісты, якія, складаючы ўрадовую большасьць, увесь час адмаўляліся ўвайсьці ў урад і не давалі яму магчымасьці правясьці фінансавае рэформы. Дзякуючы гэтаму кабінэты падалі адзін за адным, калі гэтага хацела апазыцыя. І ў рэзультаце сучасны кабінэт Брыяна папаў у поўную залежнасьць ад правай апазыцыі, дзякуючы падтрыманьню якой яму ўдалося давясьці да канца вайну ў Мароко і Сірыі, правясьці частку фінансавых рэформаў, спыніць спаданьне курса франка і дабіцца паразуменьня з Амэрыкай у справе ваенных даўгоў, што дае Францыі магчымасьць атрымаць новую вялікую пазыку ў Амэрыцы, без якой Францыя ня можа абыйсьціся. Пасьля гэтага Брыян падтрыманы правай часткай радыкалаў, пастанавіў пераменіць сваю пазыцыю ў адносінах да сваіх быўшых хаўрусьні-

Вызначаны на 23 траўня г.г. і адложаны з прычыны апошніх падзеяў

Зьезд Заходняй Беларусі

адбудзецца у сераду, 23 чэрвеня г. г. у памешканьні „Беларускае Хаткі“.

Праграма зьезду будзе падана у наступным нумары „Беларускага Слова“.

каў—соцыялістаў. Ен увайшоў у паразуменьне з правым блёкам, зрабіўшы яму ўступку ў справе простых падаткаў. Гэткім чынам прыходзіцца лічыцца з поўным распадам францускага левага блёку радыкалаў з соцыялістамі. Гэты факт яшчэ раз сцьвердзіў, як цяжка, а нават і зусім немагчыма, супрацоўнічаць з соцыялістамі. І цяпер Францыя знаходзіцца напярэдадні перамены напрамку сваей палітыкі ўправа.

Гэткі-ж рэзкі паварот управа, пасьля апошніх выбараў зрабіўся і ў Румыніі. Румынія наагул адзначаецца несталасьцю сваіх палітычных настрояў. Гэтак, напрыклад, народная партыя гэн. Аверэску на выбарах у 1920 г. атрымала 260 мандатаў, у той час як партыя лібэралаў Братыяну атрымала толькі 7 мандатаў. У 1922 годзе ўлада пераходзіць да Братыяну; адбываюцца новыя выбары, на якіх лібэралы атрымліваюць ужо 250 мандатаў, а гэн. Аверэску толькі — 10. На апошніх выбарах, адбыўшыхся 25 траўня, партыя Аверэску ізноў перамагла. Народная партыя атрымала 288 мандатаў, у той час як нацыянальна-сялянскі блёк—толькі 75. Соцыялісты і комуністы не атрымалі ані воднага мандата.

БРУДНЫ ШАНТАЖ.

У беларускай комуністычнай рэптыліі „*Беларускай Справе*“, ад 4 чэрвеня № 14, зьмешчаны „пратэст“ ад імя „скончыўшых“ вучняў Віленскай Беларускай Гімназіі.

Ужо самая форма гэтага „пратэста“ ясна кажа аб тым, хто яго фактычна пісаў. Есьць тут і „дэфэнзыўная прэса“ і напады на „паважанага (?) дзеяча“ і „*духовага правадыра* Беларускага Адраджэньня Антона Луцкевіча(?!)“. Адным словам. зусім ясна праглядвае тут рука ўсё таго-ж ананімнага аўтара (агэнта-прафэсыянала А. Луцкевіча!)

Але справа ня ў ім. Мы лічым, што нельга галаслоўна бараніць таго, хто *сам* ня можа сябе абараніць ад абвінавачаньняў у антымаральных і няэтычных паступках, зробленых яму на падставе дакумэнтаў. Няма нічога дзіўнага, калі, ня гледзячы на гэтыя закіды, уселякая комуністычная і комунізуючая пошкудзь лічыць яго сваім „дзеячом“ і „правадыром“. Але мы зробім усё ад нас залежнае, каб спыніць сыстэматычнае калечаньне гэтым комуністычным „правадыром“ нашай нясьпелай вучнёўскай моладзі.

У зьвязку з надрукаваньнем гэтага „пратэста“, у нашу рэдакцыю зьявіліся 6. вучні Віленскай Белар Гімназіі, подпісы якіх стаяць пад гэтым „пратэстам“, і вытлумачылі нам, *што яны былі прымушаны падпісаць гэты „пратэст“, бо яго далі ім для подпісу яшчэ за д в а м е с я ц ы перад выпускнымі экзаменамі,*

З гэтага ясна відаць:

1) што „пратэст“ гэты ёсьць новым фактам калецтва беларускай вучнёўскай моладзі, бо ён мае характэр *яскрава палітычны*, скіраваны на абарону комуністычнага дзеяча і быў падпісаны вучнямі (*якія ў той час яшчэ ня скончылі Гімназіі!*);

2) што „пратэст“ гэты ёсьць рэзультатам шантажа, бо вучням якія-б яго не падпісалі, бязумоўна пагражалі бы рэпрэсіі і розныя „неспадзеўкі“ на экзаменах, бо ўжо і раней былі факты, калі тых вучняў, якія не хацелі слухаць сваіх палітычных „кіраўнікоў“, выганялі з інтэрнату;

3) што гэты „пратэст“—*фальшывы і падложны*, бо ў ім падана, што падпісаўшыя яго ўжо скончылі Гімназію („6 вучні“), у той час як у часе падпісаньня „пратэсту“ яны былі яшчэ *чыннымі* вучнямі;

4) што вучні падпісалі гэты „пратэст“ *яшчэ два месяцы назад*, а агэнт-прафэсыянал, для сваіх паскудных комуністычных мэтаў,—проста сфальшаваў дату, паставіўшы 1—VI.

Падаючы гэты новы агідны факт да ведама бацькоў і грамадзянства, паўтараем, што мы зробім ўсё магчымае, каб нарэшце спыніць маральнае калецтва безбароннай беларускай вучнёўскай моладзі.

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

У ПОЛЬШЧЫ.

— 8 чэрвеня Прэзыдэнт Рэспублікі надпісаў дэкрэт аб назначэньні новага ўраду. Склад ўраду наступны: прэмьер і міністар калеі — праф. К. Бартэль, міністар унутраных справаў—К. Младзяноўскі, вайсковы — Маршалак Я. Пілсудскі, фінансаў—Клярнэр, справядлівасьці—Макоўскі, прамысловасьці і гандлю—Квяткоўскі, публічных работаў—В. Бранеўскі, працы і апекі—С. Юркевіч. Адначасова назначаны кіраўнікі міністэрстваў: заграніічных справаў—А. Залескі, рэлігіяў і асьветы — праф. Я. Мікулоўскі-Паморскі і зямельнай рэформы—Я. Рачынскі.

— Левыя партыя дамагаюцца роспуску Сойма і вызначэньня новых выбараў не пазьней кастрычніка г.г.

— У канцы гэтага месяца мае адбыцца паседжаньне Сойма для разгляду праэкту аб зьменах Канстытуцыі. Пытаньне аб спосабе роспуска Сойма і Сэната будзе вырашана гэтымі днямі.

— Соймавыя клюбы левых польскіх партыяў „Клюбу Працы“, „П. П. С.“ „Вызваленьня“ і „Сялянскай Партыі“ прынялі рэзалюцыі, у якіх дамагаюцца тэрыторыяльнай аўтаноміі для беларускай і ўкраінскай нацыянальных меншасьцяў.

— З прычыны назначэньня праф. Бартэля прэмьерам, у „Клюбе Працы“ адбыліся перавыбары прэзыдыума. Старшынёю выбраны - пасол М. Касьцялкоўскі, сэкрэтаром Хамінскі.

— Агульная лічба безработных у Польшчы за месяц травень зьменшылася на 16.400 чалавек.

З ЗАГРАНІЦЫ.

АНГЛІЯ. Ангельскі ўрад выслаў Савецкай Расеі ноту, у якой пратэстуе проці фінансавага падтрыманьня бальшавікамі гэнэральнай забастоўкі ў Англіі і заяўляе, што калі Саветы і далей будуць прысылаць грошы на падтрыманьне забастоўкі, дык ангельскі ўрад будзе прымушаны спыніць дыплёматычныя зносіны з Сав. Расеяй.

— Забастоўка ў вугальнай прамысловасьці цягнецца далей. Перагаворы з прадстаўнікамі бастуючых работнікаў не далі рэзультатаў.

ШВЭЙЦАРЫЯ. У Жэнэве адбываецца чарговая сэсія Рады Лігі Народаў. У часе дыскусіі па пытаньню аб павялічэньні лічбы месц для заўсёдных сябраў, прадстаўнік Гішпаніі заявіў, што непрызнаньне для Гішпаніі заўсёднага месца прымусіць яе адмовіцца ад далейшага супрацоўніцтва у Лізе Народаў. Аднак Рада Лігі аднагалосна прызнала немагчымым даць заўсёдныя месцы Гішпаніі, Бразыліі і Польшчы. Заўсёднае месца атрымае толькі Нямеччына, а Польшча будзе мець—часовае. У рэзультаце гэтае пастановы, прадстаўнік Бразыліі заявіў, што Бразылія выходзіць са складу сябраў Лігі Народаў. Між іншым Рада Лігі Народаў прыняла пастанову аб спыненьні фінансавага кантроля над Аўстрыяй.

У сувязі з выхадам Бразыліі з Лігі Народаў, паўстаў праэкт падзелу Лігі Народаў на тры групы: эўрапэйскую, амэрыканскую і азіяцкую, з тым, што паасобныя дзяржавы атрымалі-бы месцы ў тых групах, у якіх яны маюць інтарэсы.

ФРАНЦЫЯ. Справа адстаўкі кабінэта Брыяна яшчэ ня вырашана. Абгаварываецца праэкт утварэньня коаліцыйнага ўраду, у склад якога ўвайшлі-б прадстаўнікі ўсіх партыяў.

НЯМЕЧЧЫНА. Пытаньне аб адшкадаваньні былых пануючых фаміліяў вельмі завастрылася. У зьвязку з гэтым магчымы роспуск рэйхстага.

ЧЭХА-СЛАВАКІЯ. У Празе, у часе комуністычнай дэманстрацыі дайшло да крывавай бойкі паміж паліцыяй і

М. Казыроў.

„Карамасава“.

У гэтым маленечкім апавяданьні вельмі ярка абрысована, як вёска праймаецца комуністычнай „культурай“.

Работнік Сымон Флораў, атрымаў на нейкі час звальненьне ад работы, надумаў наведацца да сваіх крэўных, якія жылі на вёсцы „Крытыя Вярхі“. Дзесяць гадоў ня быў; што цяпер там на вёсцы?

— Тратуары, хаты-чытальні, культура... думаў ён.

І першае ўражаньне не ашукала яго надзеяў. На першай-жа хаце ён убачыў зьліняўшую ад часу, але, відаць некалі чырвоную з золатам дашку з напісам: „Агропункт вёскі імені Карла Маркса“. На другой хаце—побач, вісела вывеска: „Вэтэрынарны пункт“. Праз дом—хата-чытальня, недалёка ад пляцу—знаходзіўся „райсавет“ і нават вясковы клюб; побач з ім крама ЕПО; далей —„Вынаймы сельска-гаспадарчых машын“; на самым пляцу—стаяла чырвоная будка: „Прадажа газэтаў і брашураў“ і нат узвышаўся высокі стоўб а на ім—гіпсавы бюст Карла Маркса. Да стоўба быў прывязаны чыйсьці конь.

Гэта абурыла Сымона. Ен саскочыў з возу і прывязаў каня да плоту.

— А як-жа, знайшлі месца!

— А у нас сяньня сьвята, — спаткалі яго крэўныя. Пойдзем у царкву?

Сымон засароміўся: для пачатку не хацелася спрачацца.

— А мо' ты комунію прызнаеш? Кажы! Толькі у нас усе ў царкву ходзяць — і партыйныя... Поп у нас строгі...

— А што ён партыйнаму зрабіць можа?

— Як што? Ня дасьць прычасьця. Мы самі, гаворачы па праўдзе,—спачуваем, але і Царства Нябеснае прапусьціць, сам разумееш...

У царкву Сымон не пайшоў. Крэўныя паказалі дзе жыве прадседацель райсавета і ён скіраваўся туды.

— Што-ж гэта у вас: коні да помніка Карла Маркса прывязуюць? спытаўся ён у прадседацеля.

— Ды гэты помнік, бач, у нас дзеля таго, што і вёска цяперака ўжо не Крытыя Вярхі; — камісар, гэта да нас гады тры, а мо' і болей таму прыехаў, дый назваў па імяні Карла Маркса. Вось з тых пор мы так і называемся: Карамасава, а не Крывыя Вярхі. А датычна коні—нічога сказаць не магу: ня ведаю.

— А хто такі Маркс? запытаўся Сымон.

Прадседацель нічога не адказаў.

— Выбіраюць ў Саветы адсталых людзей, падумаў Сымон і пайшоў у клюб.

— Пэўне ўся моладзь там, не ў царкву-ж ёй ісьці!

З хаты выйшла старая-старая баба.

— Чаго табе родненькі?

— Ці ёсьць хто ў клюбе? — запытаў яе Сымон.

— Штосьці не ўцямлю... Мар'я!—закрычала старая.

Выйшла кабета.

— У клюбе, пытаюся, ёсьць хто?

— Які—такі клюб?—зьдзівілася кабета?

— А вось вывеска гэтая? ткнуў Сымон пальцам на дошку з чырвоным напісам.

Кабета зарагатала.

— Дашка? Як бачу—не тутэйшы ты... Дашку гэтую хлапчукі знайшлі на дарозе, прывалаклі, а я бачу—чырвоная ды пекная, вось і павесіла. Так сабе вісіць, а аб клюбах, дык мы і не чулі...

Сымон пайшоў у хату-чытальню. На дзьвярох старэнькай хаткі вісеў іржавы замок, аднак дзьверы адчыніліся лёгка. Цёмны пакойчык, а у ім—звалены у куту старыя хамуты; на сьценцы партрэт Троцкага, пад ім плякат: „Бей польскіх паноў!“

Сымон запытаўся у суседняй хаце.

— Гэта хатка? Ды жаўнеры у нас тут стаялі... чырвонаармейцы, дык ад іх засталося... Хацёнка кепская, ніхто у ёй цяпера не жыве—вось і скідываем старыя хамуты...

* * *

Па іншым „інстытуцыям“ Сымон не пайшоў. Крэўныя яму вытлумачылі, што ЕПО—толькі назоў, туды ўсё роўна ніхто тавараў ня возіць, а гандлюе пастараму Парамонаў з задняга ганку; аб „агропункце“ ніхто і ня чуў і нат не разумеюць, што гэта значыць

— А вэтэрынарны? Доктар жывёлы?

— Не! У нас Аграфена добра ад хваробы жывёлу загаварывае...

Сымон зьдзівіўся.

— Ды вы паслухайце: нашто-ж тады вывескі? Было тутка што небудзь ці не? Ніяк не зразумею, што тутка у вас робіцца

— Вывескі? зарагаталі крэўныя і паказалі Сымону гэткі абразок: ў раву стаіць стоўб, пад ім — іржавы багор бяз ручкі і тапорышча без сякеры. А на стаўбе—вялікая чырвоная вывеска: „Карамасаўскае пажарнае дэпо“.

— У нас усё так, тлумачылі яны — камісар да нас прыежджаў — тры ці чатыры гады таму, не памятаем: усё плянаваў. Галава, кажу табе! Што ні дзень—народ зганяў, дый ну ім прамову! Усё выясьніць, а пасьля вывеску начэпіць. „Новую, кажа, вёску пабудуем. Пачакайце! па апошняй тэхніцы!“ А пакуль-што вывескі панавешываў, значыць—дзе што будзе. Ты вось яшчэ на навіне нашай не быў: колькі там стаўбоў пастаўлена—мы табе пакажам! Новая вёска! Ужо нат ня ведаем, чаму ён ад нас выехаў, такі добры быў, няма слоў... Вось з гэтых самых пор вывескі усе і вісяць, шкоды ад іх няма...

Зьбеларушчыў Б. Д.

дэманстрантамі. У рэзультаце — каля 50 чалавек ранена.

ЛІТВА. Адбыліся выбары Прэзыдэнта рэспублікі. Выбраны—сябра народнай партыі, пасол Сойма, д-р Грыніус, які атрымаў 50 галасоў. За яго галасавала ўся лявіца і нацыянальныя меншасьці. Правы блёк ад галасаваньня ўстрымаўся. Створаны новы ўрад, на чале якога стаў пасол Сойму — Слежэвіч.

ТУРЦЫЯ. Нацыянальнае Сабраньне ратыфікавала ангельска-турэцкі дагавор па Масульскаму пытаньню.

КІТАЙ. Хатняя вайна цягнецца далей. Паміж гэнараламі Ву-Пэй-Фу і Чанг-Тсо-Лінам вядуцца перагаворы аб падзеле сфэраў уплыву. Магчымы падзел Кітая на пяць провінцыяў пад уладай паасобных гэнаралаў.

Далей ісьці ўжо німа куды...

Нават катаржнікі і злодзеі маюць сваю катаржную чэсьць і этыку. Але комуністычныя рэптыліі не маюць відаць і гэтай прымітыўнай катаржнай чэснасьці.

Гэтак комуністычная рэптылія „Беларуская Справа“, якая заўсёды дае гасьцінна месца для „выступленьняў“ розных „журналістаў-крыміналістаў“, Крумкачоў, Дзяргачоў і г. д., апусьцілася маральна да таго, што пачала друкаваць на сваіх шпальтах карэспандэнцыі *чынных шпікоў*, якія аслявіліся сваей работай па змаганьню з беларускім рухам.

У № 14 „Беларускай Справы“ зьмешчана ілжывая карэспандэнцыя групы баранавіцкіх сышчыкаў, падпісаная Аўгенам Міткевічам, які, апрача крымінальных спраў (па абвінавачаньню ў растраце 1.000 злотых беларускага дзіцячага прытулку ў Горадні), уславіўся яшчэ сваёй супольнай працай з Фэліцыянам Цаўлоўскім, вядучы пад „пакрывіцельствам“ Наваградзкага ваяводы Янушайціса дэнацыяналізацыйную і палёнізатарскую работу ў Навагрудчыне.

Вялікшага маральнага ўпадку ўжо быць ня можа!

ПРАТЭСТ УКРАІНЦАЎ.

Агіднае забойства бальшавіцкім наймітам Галоўнага Атамана Войск Украінскай Народнай Рэспублікі С. Пятлюры выклікала вялікае абурэньне ўсяго ўкраінскага грамадзянства.

Нам прысланы для апублікаваньня гэткі пратэст калёніі палітычных украінскіх эміграутаў у м. Тарнове:

„25 траўня 1926 года ў м. Парыжы нягодная рука забіла Старшыню Дырэкторыі і Галоўнага Атамана Войск Украінскай Народнай Рэспублікі - Сымона Пятлюру.

З вялікім абурэньнем і рашуча адкідаем тэндэнцыйныя інтэрпрэтацыі некаторых органаў прэсы, якія на падставе брахлівых слоў камуніста-бальшавіка, робяць нашаму правадыру закіды аб жыдоўскіх пагромах і гэтым хочуць зганьбіць памяць Вялікага Нябошчыка, а самы факт забойства выставіць, як помсту фанатыка—жыда.

Не, ня жыдоўства, а чырвоная Масква, рукамі свайго жыдоўскага найміта, забіла нашага Вялікага Правадыра.—Не помста, а — палітычнае забойства! — Выкананьне пастановы 3-га Інтэрнацыянала, гэтай міжнароднай агентуры чырвонай Масквы,—аб індывідуальным тэрроры — вось запраўдная прычына забойства.

Але няма той сілы, якая магла-б забіць вялікую ідэю. Ідэю якую цэлыя пакаленьні палілі сваёю крывёю. Не паможа тут нават забойства яе найвялікшага прадстаўніка і змагара.

І вось мы, якія ў працэсе барацьбы—*часова* перамажаны, якія прымушаны былі нават кінуць свой родны край, яшчэ больш узмацнёныя і злучаныя сьветлай памяцьцю Правадыра, мы заяўляем, што *барацьбы не спынім і перад тэррорам не схілімся; а самы факт агіднага забойства прымаем, як заклік да новай яшчэ вастрэйшай барацьбы за дзяржаўнасьць і сувэрэннасьць Украіны.*

Калёнія палітычных украінскіх эміграутаў м. Тарнова ў Польшчы.

У С. С. Р. Р.

Пачынаецца...

Мы ўжо пісалі, што абураныя жыдоўскай калёнізацыяй сяляне украіны выслалі да Украінскага ураду дэлегацыю, якая патрабавала спыненьня калёнізацыі. Сяляне заявілі, што яны не пацерпяць болей, каб побач з тым, як на вёсках і хутарах мясцовыя спрадвечныя гаспадары Украінскай зямлі ня могуць дачакацца прырэзкі і застаюцца на 1—2 дзес., землі суседніх маёнткаў аддаваліся неземляробам чужынцам жыдам на калёніі, у якіх даюць па 10—15 дз. найлепшай зямлі на гаспадара. Пры гэтым дэлегаты прыгразілі, што калі калёнізацыя ня будзе спынена, дык сяляне самі пачнуць „ліквідаваць“ калёніі.

Урад быццам пайшоў на ўступкі: быў выданы дэкрэт аб „прыстаноўцы“ калёнізацыі да 1 студня 1927 г. але, выдаўшы гэты дэкрэт, фактычна робіць сваё. І вось—пагрозы свае сяляне пачынаюць спаўняць, праўда тымчасам часьцічна, але відаць толькі дзеля таго, каб урад меў перасьцярогу, што гэтая пагроза—не жарты, а мо і дзеля таго, каб паказаць жыдам, што забіраючы зямлю яны рызыкуюць паставіць процi сябе ўвесь украінскі народ. Харкаўская газэта „Камуніст“ падрабязна апісвае як сяляне спалілі жыдоўскі „колектыў“ у Бэрдычаўскай акрузе пад назовам: „Чырвоні Зоры“. Справа мелася так. У гэтым месцы было сяло „Іванькаўцы“ жыхары якога даўно цярпелі ад малазямельля. Ды і наагул уся усей акрузе—малазямельныя. Сярэдні нормай—было тут 1 дзес. на душу. А ў вёсцы Іванькаўцы — на душу выпадала толькі 0,6 дзес. Дзеля гэтага жыхары Іванькаўцаў ужо 5 гадоў таму пачалі сільна клапатаць аб аддачы ім 121 дзес. з суседняга маёнтку, у якім была зроблена неякая „агробаза“. Улады аднак ня толькі не далі ім гэтай зямлі, але *адабралі* іх уласны 43 дз. і гэтыя 43 дз. далучышы да той „агробазы“ —адвялі ўжо гэтую зямлю пад нейкі прыезны жыдоўскі „калектыў“. Калектыў гэты складаўся з 16 семьяў ніколі не займаўшыхся земляробствам дзеля гэтага часьць атрыманай зямлі калёністыя адразу аддалі ў арэнду а часьць пачалі абрабляць праз наемных работнікаў. Зразумела якія пачуцці вызвала ўсё гэта сярод тых, ад якіх адабралі ня толькі тую, на якую яны ахвопіліся зямлю, але нават іх уласную! І

† Ганна Малойла.

26 траўня г. г., у сваей роднай весцы Круты-Бераг, Нясьвіскага пав., памёрла ад сухотаў—гэтай стаўшай ужо тыповай для беларускага інтэлігэнта хваробы—б. вучыцелька Клецкай Беларускай Гімназіі—Ганна Малойла.

Усё сваё жыцьцё Ганна Малойла аддала на бескарыснае служэньне свайму роднаму, гаротнаму народу. Усё сваё нядоўгае жыцьцё яна працавала на карысьць яго Адраджэньня на ніве народнай прасьветы.

Скончыўшы ў 1921 г. беларускія вучыцельскія курсы ў Вільні, Ганна Малойла ўвесь час працавала на вёсцы, як вучыцелька ў беларускіх пачатковых школах.

У 1922 годзе яна пераходзіць на пасаду вучыцелькі ў Нясьвіжскую Беларускую Гімназію. Пасьля зачыненьня Нясьвіскай Гімназіі Ганна Малойла перайшла ў Клецкую Белар. Гімназію, дзе працавала да вясны 1925 г., калі цяжкая хвароба прымусіла яе выехаць у Вільню лячыцца. Да працы ў Гімназіі яна ўжо больш не вярнулася.

Паміж сваіх калегаў і гадунцоў памершая пакінула па сабе найлепшую памяць.

Канец чырвонага чалавека.

I.

У адзін нядзельны дзень, увосень 1917 года вёска Чэпухоўка жыла зусім адменным жыцьцём.

Віноўнік гэтага быў жыхар гэтай-жа вёскі Грышка Мануйлаў, толькі што прыехаўшы на пабыўку з Петраграда, дзе ён служыў у адным з гвардзейскіх палкоў.

Яго рэвалюцыйнае пачуцьцё і запал не давалі яму супакою, а гэткае здарэньне, як прысуд на сьмерць аўстрыяцкім судом вядомага соцыяліста Фрыдрыха Адлера за забойства прэмьера Штюргка, пабудзілі яго зрабіць дэманстрацыю, каб Чэпухоўскі голас пратэсту далучыць да пратэсту ўсяго соцыялістычнага сьвета.

Сам Мануйлаў трымаў чырвоны сьцяг з надпісам „Зямля і Воля працоўнаму народу“, а далей нясьлі сьцягі з іншымі рэвалюцыйнымі лёзунгамі... Тут быў і Ленінскі канчатак вайны—без анэксіяў і контрыбуцыяў, і хлеб, і капіталы, адабраныя ад эксплёататараў на карысьць працоўнага народа, і той чырвоны рай, у якім знайшоў свой сумны лёс вясёлы Мануйлаў...

Безстаронны глядзельнік ужо тады мог прадбачыць сумны канец добрага пачатку, але стаць насупроць стыхіі і ўстрымаць яе віхравыя ўзмахі—было ўжо немагчыма.

Самадзяржаўныя сатрапы—цары, трымаўшыя расейскі народ у адвечным замкненьні безпраўнай цемры, былі галоўнымі віноўнікамі тых жудасных выпадкаў, ад якіх згінулі яны самі і ад якіх марнее цяпер увесь расейскі народ.

Рэвалюцыянэр Мануйлаў, водзячы натоўп чэпухоўскага насяленьня з рэвалюцыйнымі сьпевамі па Чэпухоўцы, часта прыпыняўся і становячыся на ўслончыку, які бязупынна за ім насілі, сыпаў і сыпаў абяцанкамі, сэнсу якіх ня мог аналізаваць сваім абмежаваным розумам. Ён гаварыў аб тым, што таварыш Ленін хоча адабраць ня толькі зямлю і фабрыкі, але і капіталы. Спосаб на гэта вельмі просты—трэба забіць толькі некалькі капіталістаў, а рэшта іх па добрай волі, самі прынясуць свае грошы і пакорна зложаць іх пад ногі новай чырвонай Вялікасьці. Гэтак казаў сам Ленін на паседжаньні Петраградзкага Саўдэпу ў часе дыскусіі па гэтаму пытаньню з тагачасным „дыктатарам“ Керанскім.

За ўсё дастаецца Керанскаму ад Чэпухоўскага Мануйлава, а асабліва за тое, што ён вядзе і хоча далей весьці крывавую бойку-вайну. Але трэба толькі паставіць на чале ўлады бальшавікоў, як адразу-ж усё пераменіцца і абаротная старана меднай мэдалі абавязкова будзе залатою. Тады адразу скончыцца вайна без анэксій і контрыбуцый, на падставе самаазначэньня народаў; тады вернуцца з акопаў да сваіх бацькоў, жанок і дзетак — салдаты; тады зьявяцца горы гатовага хлеба, а працаваць трэ будзе не 8 гадзін у дзень, а толькі 2 гадзіны на тыдзень.

Прасьцей кажучы, калі ўлада дастанецца Леніну і яго хаўры, дык будзе спакой, хлеб і свабода...

Ад раніцы да вечара цягнулася чэпухоўская маніфэстацыя... Натоўп зьмяняўся: адны адыходзілі, другія прыходзілі. Толькі Мануйлаў крычаў без супачынку і трэ было дзівіцца запасу яго энэргіі і вытрываласьці. У Мануйлава бязумоўна было шмат няізжытай энэргіі, толькі ня было галоўнага—розуму. А энэргія без розуму ўсёроўна, што карабель без руля, які будзе плыць туды, куды пагоніць яго вецер, ці панясе цячэньне вады; які ня зможа абмінуць перашкодаў чыннікаў прыроды і ўрэшце наткнецца на камень, рыф, мель, або проста разаб'ецца аб бераг...

Ці-ж інакш праходзіла расейская рэвалюцыя? Ці-ж не апынуўся расейскі народ паміж двох галоўных чыньнікаў: дэмакратычнага розуму без энэргіі і бальшавіцкай энэргіі без розуму? І ці-ж не разламаўся ён, уся яго ідэалёгія пад упывам гэтых чыньнікаў?..

. . . .

Захад сонца збавіў Мануйлава ад церазмернай працы ў гэты дзень, але прахладная ноч не прынесла адпачынку яго распаленаму пачуцьцю.

Дэманстрацыя чэпухоўцаў ні ў кім і ніякіх сьлядоў не пакінула, але памяць людзкая запісала чыннасьць Мануйлава, каб было што ўспамянуць пры другім, ужо апошнім здарэньні ў яго жыцьці.

II.

Сталася так, як хацеў Мануйлаў, але далей пайшло зусім інакш. Ня гледзячы на тое, што комуністы заселі ў Маскоўскім Крэмлі, вайна ня скончылася. Аб свабодзе няма чаго й казаць. Ну, а хлеб? Яго ў чырвоным раі трэба здабываць прост нечуванымі высілкамі... Праўда, Грышка Мануйлаў вярнуўся з акопаў дамоў. Першыя тыдні ён жыў яшчэ рэвалюцыйным запалам, ня думаючы аб хлебе... Але, як не круці языком, ад гэтага сыты—ня будзеш...

Дзень за днём, тыдзень за тыднем, час ляцеў і гінуў. І вось прыйшоў 1919 год, калі над паўночнай і сярэдняй Расеяй запанаваў сын бальшавіцкага ўладаньня — Голад. Пад яго сьмяротнай пагрозай зьніклі каляровыя лёзунгі, а загаварылі вымаганьні штодзённага жыцьця.

Перад гэтым фактарам не ўстаяў і Грышка Мануйлаў. Ён зразумеў, што можна наесьціся не лёзунгаў і абяцанак, а толькі хлеба. Але дзе яго ўзяць, калі ўсё праглынула чырвоная акула?.. А зразумеўшы, Грышка, разам з іншымі пусьціўся ў сьвет шырокі за хлебам...

. . . .

Паміж Знамянкай і Цьвятковам, станцыямі паўднёвых жалезных дарогаў, перад вечарам першага мая, ішоў цягнік. Увесь дах яго вагонаў быў аблеплены людзьмі і іх мяхамі...

На дарожным адкосе стаяў здаравенны чалавек і, трымаючы ў руках прывязаны да вяроўкі гак, чакаў на цягнік. Яго спосаб жыцьця быў вельмі просты: сьцягнуць гакам з вагона пуд, другі, і годзі... Гэтак зрабіў ён і ў гэты раз. Але сяньня яму не пашанцавала... Закінуты за здабычай гак яго зачапіў жывое чалавечае цела, якое бы куль нейкі з усяго маху руху цягніка і сваей вагі—шлепанулася да ног жаўпа...

. . . .

Цягнік згінуў за выхілам.

У сьмяротным жаху зьбег лавец, на'т пакінуўшы мех. А побач гэтага меху, на дарожным насыпу, з разьбітай галавой і тырчачым у сьпіне гакам ляжаў труп Грышкі Мануйлава...

Разумнік.

вось амаль з першых дзён пасяленьня калекціва пачаліся эксцэсы, якія выразіліся ў радзе забойстваў, падпалаў і г.д. Сельскія ўлады былі на старане салян. Аднак ў цэнтры не хапелі нічога зрабіць каб здаволіць слушнае абурэньне. І вось ў канцы канцоў—ўвесь калектыў быў падпалены і ўсё: будынкі, інвэнтар, запасы г. д. згарэла да тла.

Невядома йшчэ, што „ўлады“ зробяць з гэтым „скандалам“, але нат „Камуніст“ выказваецца, што рабіць калёніі сярод малазямельных, ды яшчэ коштам іх зямлі—зьяўляецца „недапусьцімым“...

А мы думаем, што як бы там ні рэагавала „ўлада“ на „эксцэсы“—сяляне не дадуць зямлі чужынцам, і выпадак з калёніяй у Бэрдычаўшчыне ці ня ёсьць пачаткам зьліквідаваньня праз самы народ спробаў аддаць зямлю чужынцам.

Дзіўна толькі, што жыды гэткія заўсёды празорлівыя — не разумеюць усей небясьпекі калёнізацыі і самі лезуць на ражон.

500.000 безпрызорных.

Ужо амаль ня цэлы год, як улады „зьвярнулі ўвагу“ на небывалы ўзрост безпрызорных дзяцей. Яны запоўнілі гарады, імі поўны цягнікі. Злачынствы распуста, бандытызм, вэнэрычныя хваробы, якія нясьлі з сабой масы гэтых бяздомнікаў—змусілі ўрэшце верхаводаў „раю“ „прыняць меры“. Пачалася лоўля дзяцей; іх замыкалі ў спэцыяльныя дамы-прытулкі, адсылалі да вёскі і г. д. Аднак нічога не памагае і лік безпрызорных амаль з кожным днём расьце і расьце. Па апошнім данным савецкай прэсы ў апошні мамэнт лік бяздомных дзяцей дайшоў да 500.000. Пры гэтым больш 300.000 нідзе нельга прыстроіць, а больш 18.000 „высьпэцыялізаваліся“ на чугуначных падарожах і зьяўляюцца „гразой пасажыраў“. Спробы прыстроіць іх дзе небудзь на работы, ці як інакш — дагэтуль не ўдаюцца. Большасьць іх мае 10—14 гадоў.

Ізноў працэс чырвоных камандзіраў.

Ужо ня першы раз прыходзіцца Саўдэпскім Судам разьбіраць справы аб „здрадзе“ чырвоных камандзіраў. Псуецца нешта ўся машынка Троцкіх і К о. І „апора“ чырвоных цароў г.зв. „чырвоныя камандзіры“ ўсё часьцей пачынаюць бунтавацца проці загадаў сваіх уладык.

Па апошнім весткам 10 траўня ў Галоўным ваенным Судзе у Віцебску разьбіралася справа б. камандзіра 14 чырвонай дывізіі Цырэвіча, начальніка штабу гэтай дывізіі Чыжава, камандзіраў Вахніна і Кільчэнка, а таксама 11 чырвоных унтэрафіцэраў. Усе яны абвінавачываліся ў тым, што ўвосені 1924 г., калі дывізія была паслана ў Беларусь для ўсьмірэньня сялянскіх беспарадкаў, Цырэвіч аддаў прыказ брыгадзе, якая была ўжо на месцы,—вярнуцца на месца сваёй стаянкі і гэткім чынам невыпаўніў баевога загаду. У ходзе сьледства выясьнілася, што Цырэвіч і інш. мелі сувязь з антысавецкімі арганізацыямі. Цырэвіч Чыжаў, Вахнін, Кільчэнка і 4 унтэра былі прыгавараны да расстрэлу, а 7 чырвоных унтэраў — на вечную катаргу. Прыгавор выпаўнены.

Яшчэ італьянцы?

Па апошнім весткам Чычэрын зьбіраецца паехаць у Бэрлін і Рым. У Рыме ён мае зрабіць з Мусалінім дагавор аб усходніх справах. Пры гэтым мае запрапанаваць, узамен за прэтэнсыі італьянцаў да турэцкіх уладзеньняў—аддаць значныя абшары зямлі на поўдні Украіны дзеля калёнізацыі італьянцамі...

Мала таго, што аддаюць зямлю жыдам, а яшчэ і італьянцам І за тое, каб звольніць туркаў?... Вось дык „благадзецелі“. Нат аб турках думаюць. Ня думаюць вось толькі аб тым, дасьць ці не сваю родную зямельку чужынцам селянін-украінец.

Тутэйшая хроніка.

Новы працэс ахвяры Луцкевіча. 11 чэрвеня Віленскі Акружны Суд разглядаў чарговую справу б. рэдактара комуністычных Луцкевічаўскіх рэптыліяў—Мікалая Шылы. Як ведама М. Шыла меў ужо некалькі „рэдактарскіх“ справаў, за якія быў засуджаны і пасаджаны ў Лукішскую турму.

На гэты раз Шылу абвінавачывалі ў надрукаваньні ў „Голасе Беларуса“ 2 артыкулаў антыдзяржаўнага зьместу. Справа разглядалася пры зачыненых дзьвярох Суд прызнаў Шылу вінаватым і засудзіў на адзін год цяжкай турмы з пазбаўленьнем правоў.

Вось як пакутуюць нешчасьлівыя ахвяры „паважанага дзеяча“ і агэнта-прафэсыянала Луцкевіча.

Справа кс. Гадлеўскага. 12 чэрвеня Віленскі Апэляцыйны Суд разглядаў справу вядомага беларускага дзеяча кс. Гадлеўскага. Акружны Суд, у якім справа кс. Гадлеўскага разглядалася ў пачатку сакавіка г.г., засудзіў яго за антыдзяржаўныя выступленьня на 2 гады крэпасьці. Па жалабе старон справа перайшла ў Апэляцыйны Суд.

Усё беларускае грамадзянства спадзявалася, што другая інстанцыя адменіць гэты суровы прысуд. Але Апэляцыйны Суд, разгледзіўшы справу нанова, прысуд Акружнага Суда—зацьвердзіў.

У праваслаўнай Духоўнай Сэмінарыі. 14 чэрвеня ў Віленскай Духоўнай Сэмінарыі пачнуцца выпускныя экзамены для вучняў 8 клясы. Цяпер адбудзецца толькі палова ўсіх экзаменаў, а рэшта будзе перанесяна на вясну 1927 года.

Забастоўка шаўцоў. Ужо некалькі дзён цягнецца ў Вільні агульная забастоўка шаўцоў, якія дамагаюцца павялічэньня заработнай платы. Агулам бастуе каля 900 шаўцоў.

Добрыя рэзультаты. Па афіцыяльным данным, на апошні прызыў радзіўшыхся ў 1905 годзе зьявілася 97,5 працэнта ўсіх прызыўных.

Вучэбны збор рэзэрвістаў. Выдана распараджэньне аб прызыве на вучэбны збор тых шэрэгоўцаў рэзэрвы 1899 і 1900 г.г. катэгорыі *А*, якія ў мінулым годзе яшчэ не адбылі збора. Вучэбны збор будзе адбывацца ад 30 жніўня да 25 верасьня г.г.

Паменшаньне безрабоцьця. За апошні тыдзень лічба безработных у Вільні паменшылася на 35 чалавек.

Перапіс насяленьня. Агульная перапіс насяленьня Віленшчыны, якая была вызначана яшчэ ў прошлым годзе, адбудзецца ў канцы кастрычніка г.г.

Курс на трошы. За апошнія дні ўстанавіўся цьвёрды курс злотага. Польскі Банк увесь час плаціць за даляр—9 зл. 98 гр. У прыватных абаротах курс даляра—10 злотых.

ЮРЫДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ.

Падп. Я. Г-ку. Запытаньне: У 1921 г. памёр мой дзядзька, запісаўшы тэстамэнтам сваю зямлю і іншую маемасьць зусім чужой кабеце, з якой апошні час жыў. Яна тэстамэнт гэты зацьвердзіла ў тым-жа 1921 г. і ўладае маемасьцяй, а мы г. зн. я і мой брат, найбліжэйшыя крэўныя — нічога не атрымалі. Ці можна зьніштожыць тэстамэнт і як?

Адказ. Позвы аб зьніштажэньні тэстамэнту, як і наогул ўсе спорны проці тэстамэнту, павінны быць пададзены ў працягу 2-х гадоў ад даты публікацыі аб зацьверджаньні тэстамэнту праз Суд. Зрабіце спраўку (у ме цовага судзьзі) ў „Dodatku do Dziennika Urzędowego Ministerstwa Sprawiedliwości“ калі выдрукована публікацыя аб зацьверджаньні да выкананьня тэстамэнту вашага дзядзькі і калі яшчэ ня вышла поўных 2 гадоў, дык падавайце ў Акружны Суд „powództwo“ аб ўневажненьні тэстамэнту. Калі-ж 2 гады прайшло—няма чаго і рабіць.

Падп. Г. С—ку. *Запытаньне*: Вярнуўшыся з бежанства на свой надзел, я заўладаў і часьцяй свайго брата, які застаўся ў Расеі. Гэтай часткай я ўладаю з 1920 году. Аплачываю ўсе падаткі, адбываю павіннасьці. У восені мінулага году аднэй паласой вучастка брата самавольна хацеў заўладаць цесьць адсутнага брата. Я не дапусьціў і ён быццам успакоіўся. Але цяперака ізноў улез і загараў паласу папару. На маі спрацівы адказвае, што я ня маю права забараняць карыстацца яму, або каму другому, бо зямля не мая. Ці магу я судзіцца з ім?

Адказ. Усякае нат незаконнае фактычнае ўладаньне закон абараняе. Вы як фактычны ўласьнік зямлі маеце правы бараніць яе ад захватаў старонніх. Падавайце на захватчыка ў Міравы Суд позву аб восстанаўленьні Вашага ўладаньня.

Сялянам вёскі Клапытычы, Сіняўскай гміны. Па справе аб спагоняньні з вас праз гміну збожжа на стойку і аб 230 падводах, якія вы далі ў натуры, Прэзыдыум Рады зьвярнуўся да п. Старосты Нясьвіскага з просьбай разабраць справу і зрабіць парадак. На гэта Рада атрымала наступны адказ:

„Паветовы аддзел Нясьвіскага Сэйміку, 7. VI 26 г. № 2605. У справе падводнай павіннасьці ў Сіняўскай гміне. Да Прэзыдыўму Часовай Беларускай Рады ў Вільні, Нямецкая вул. № 1 Готэль Сакалоўскага, кв. 1. У адказ на пісьмо Рады да Нясьвіскага Старостава, ад 17. V. 6 г. г. № 90. у справе адбываньня падводнай павіннасьці праз вёску Клапытычы, Сіняўскай гміны, выясьняю: Урад Сіняўскай гміны ні з жыхарамі вёскі Клапытычы, ні іншых вёсак адносна спосабаў адбываньня падводнай павіннасьці ніякіх дагавораў не рабіў, а войт вёў толькі перагаворы з адзельнымі грамадамі з мэтай выясьненьня іх погляду адносна замены падводнай павіннасьці ў натуры на грашавую або збожжам.

Конная пошта пры гмінным урадзе была нанята на падставе пастановы Гміннай Рады, прынятай згодна з пунктам 5 арт 22 Распараджэньня Гэнэральнага Камісара Цывільнага ураду Усходніх Зямель ад 26 верасьня 1919 г. (Dz. Urz. Z.Z.C.W. № 21), якая замяніла ў частцы падводную павіннасьць на грашавую, або збожжам. Нанятая пошта замяніла чарговую стойку пры ўрадзе гміны пачынаючы ад 1. 7. 1922 г. На аплату арэнды за пошту, Рада гмінная устанавіла спэцыяльныя ўзносы грашыма і збожжам ад каня і дзесяціны. Збор гэтых аплатаў аказаўся недастатачным і з прычыны гэтага зьявіліся даўгі па ўтрыманьню коннай пошты. Дзеля зьліквідаваньня даўгоў, а также для закупу коні, вазоў, рэмонту стайні і г. д., ўзьвязку з увядзеньнем ўласных, гмінных коні, гмінная Рада 24. 3 г. г. пастанавіла спагнаць па 3 пуды аўса ад кожнага дарослага каня і 9 ф. аўса з кожнай дзесяціны зямлі 1 катэгорыі, аб чым урад гмінны перагаварыў з грамадамі. Гэтыя чыннасьці гміннай рады не закончылі справы ўладжаньня падводнай павіннасьці ў гміне; падводы чародных стоек, (г. зв. „шарварковыя“) засталіся дзеля направы дарог, вывазу дроў для школаў і інш., кошты якіх не маглі быць унесены у гмінны бюджэт ў грашах, бо надта павялічылі-б падатковае абцяжэньне гміны: дзеля гэтага, паміма спэцыяльнай паштовай аплаты—засталася патрэба адбываньня некатарых работ дармовай падводнай павіннасьці. З выжэйпісанага вынікае, што апрача выдаткаў на пошту—не выключаецца і магчымасьць карыстаньня падводамі у натуры, але ў меншым ліку. Звольніць ад аплаты неаплачанай павіннасьці магла-б гмінная рада, якая мае на гэта права аднак у данным выпадку ня можа быць прымушана да гэтага, бо звальненьне аднэй вёскі ад аплаты, ў разьмеры гэтай гэтай аплаты накладала-б новы цяжар на тых жыхароў гміны, якія раз ужо аплацілі выпадаючую на іх долю часьць аплат-бо-ж гміна свае забавязаньні па гэтай справе — павінна пакрыць поўнасьцю“. Прэзэс Паветовага Аддзелу Старостава (—) Подпіс.

Гэткім чынам аб звальненьні ад аплаты няма чаго і гутарыць. Ідзе толькі аб залішне многа ўзятых падводах. Тут трэ устанавіць ці толькі вашая вёска дала гэткі лік падводаў ці і іншыя таксама далі ў гэткім ліку, і затым — нашто іменна былі ужыты гэтыя падводы. Па атрыманьні гэтых—дамо раду што трэ рабіць далей

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

Буйвіду. Просьбу Вашую спаўняем.

Еленеўскаму. Газэту пасылаем пачынаючы ад № 16.

А. Скваснову. Карэспандэнцыя не падыйшла.

Унівэрсытэцкай Бібліятэцы ў Львове. № 11 Газэта ўвесь час пасылаецца акуратна.

Тарасаву. Пробны нумар выслалі; прысылайце падпіску.

Малецкаму. Высылку спынілі, бо не атрымалі падпіскі.

Адказны Рэдактар Т. Верніковскі. Друк А. Дворжэца Завальная 32. Выдавец Ч. Бел. Рада